**Список использованных источников**

1. Короткевич, А.И. Денежное обращение и кредит : учеб. пособие / А.И. Короткевич. – Минск : ТетраСистемс. – 2008. – 352 с.

2. Об утверждении Инструкции о порядке предоставления денежных средств в форме кредита и их возврата (погашения) [Электронный ресурс] : постановление Правления Нац. банка Респ. Беларусь, 29 марта 2018 г., № 149 // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2020.

3. Томкович, Р.Р. Кредитное обслуживание клиентов с учетом обновленного законодательства [Электронный ресурс] / Р.Р. Томкович // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2020.

4. Пендюхов, Д.Ю. Определение кредита в теории предпринимательского права и российском законодательстве / Д.Ю. Пендюхов // Вестн. Самар. гос. ун-та. – 2006. – № 5. – С. 177–181.

5. Никончик, В. Нецелевое использование кредита / В. Никончик // Гл. бухгалтер. Банк. деятельность. – 2005. – № 3. – С. 11–13.

6. Уголовный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 9 июля 1999 г., № 275-З : принят Палатой представителей 2 июня 1999 г. : одобр. Советом Респ. 24 июня 1999 г. : текст кодекса по сост. на 11 нояб. 2019 г. // ЭТАЛОН-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2020.

7. Уголовный кодекс Российской Федерации [Электронный ресурс] : 13 июня 1996 г., № 63-ФЗ : принят Гос. Думой 24 мая 2006 г. : одобр. Советом Федерации 5 июня 1996 г. : в ред. Федер. закона от 27.12.2019 г. // КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «КонсультантПлюс». – М., 2020.

УДК 351.74 (09)

***М.А. Асадчук***, курсант факультэта міліцыі

Навуковы кіраўнік – кандытат гістарычных навук, дацэнт *С.Ф. Лапановіч*

## ПЕРАЎТВАРЭННЕ НКУС У МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ СССР (1946 г.). УДАСКАНАЛЕННЕ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПРАВАВЫХ АСНОЎ ДЗЕЙНАСЦІ ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ БССР

Пасля Перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне пераход да мірнага жыцця суправаджаўся скасаваннем некаторых надзвычайных дзяржаўных органаў, якія былі створаны ў час вайны. Напрыклад, у верасні 1945 г. быў ліквідаваны надзвычайны орган партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва – Дзяржаўны Камітэт Абароны. Яго функцыі зноў былі размеркаваны паміж Саветам Народных Камісараў (СНК), Цэнтральным Камітэтам (ЦК) УКП(б) і Вярхоўным Саветам СССР. Аднак на гэтым этапе пераўтварэнні ў органах дзяржаўнага кіравання яшчэ не былі фінальныя.

18 сакавіка 1946 г. V сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Закон аб пераўтварэнні СНК СССР у Савет Міністраў СССР, а народных камісарыятаў – у міністэрства. Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС) СССР ператвораны ў Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) СССР. Міністрам унутраных спраў СССР зацверджаны С.Н. Круглоў, а міністрам дзяржаўнай бяспекі СССР – В.М. Меркулаў. У структуры МУС СССР асноўную ролю ў забеспячэнні аховы грамадскага парадку адыгрывала Галоўнае ўпраўленне міліцыі (ГУМ) [1, с. 109].

НКУС БССР перайменаваны ў Міністэрства ўнутраных спраў БССР 26 сакавіка 1946 г. У склад яго ўваходзілі наступныя ўпраўленні: міліцыі, па барацьбе з бандытызмам, па справах ваеннапалонных і інтэрніраваных, папраўча-працоўных лагераў і калоній, турэмнага, пагранвойскаў, а таксама аддзелы – кадраў, контрвыведкі, фінансавага, сакрэтнага справаводства, па барацьбе з дзіцячай безнагляднасцю і беспрытульнасцю, «Дынама» і інш. [1, с. 109–110].

Упраўленне міліцыі (УМ) з'яўлялася ключавым структурным органам МУС БССР. Гэта ўпраўленне вызначала асноўныя напрамкі, метады і сродкі барацьбы са злачыннасцю, аховы правапарадку, абароны правоў і інтарэсаў грамадзян [1, с. 110].

Аддзелы: палітычны, крымінальнага вышуку, па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці, ДАІ, аператыўны, віз і рэгістрацыі і загса, пашпартны, а таксама аддзяленні: навукова-тэхнічных сродкаў, прапаганды і агітацыі, камсамольскай і культурна-выхаваўчай работы і рэдакцыя газеты «На страже Октября» ўваходзілі ў структуру УМ МУС БССР. [1, с. 110].

Разгледзім канкрэтныя напрамкі дзейнасці розных падраздзяленняў органаў унутраных спраў (ОУС). Пачнем з барацьбы з эканамічнай злачыннасцю, якая ва ўмовах пасляваеннага часу прадстаўляла асаблівую небяспеку для грамадства. У ваенныя гады вялікую небяспеку для дзяржавы прадстаўлялі таксама асобы, якія займаліся вырабам і збытам фальшывых грошай. Актыўна змагаліся з гэтым відам злачынстваў аддзелы па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці і спекуляцыяй – АБКСУ (створаны яшчэ ў сакавіку 1937 г. у складзе ГУМ НКУС СССР [2, с. 33].

У першыя гады аднаўлення народнай гаспадаркі ахова ўласнасці зноў набыла асоба важнае значэнне, паколькі велізарныя страты харчовых рэсурсаў цяжка адбіліся на эканамічным становішчы краіны. Служба БКСУ ў цэнтры і на месцах засяродзіла свае намаганні на барацьбе

са спекуляцыяй, крадзяжамі ў сістэме «Закупзерне», разбазарваннем фондаў, з крадзяжамі грашовых сум з кас дзяржпрадпрыемстваў, гаспадарчых і кааператыўных арганізацый [3, с. 20–21].

У студзені 1947 г. на агульнасаюзным узроўні аддзел быў рэарганізаваны ва Упраўленне БКСУ (УБКСУ) ГУМ МУС СССР, у якім утвараліся новыя аддзелы [3, с. 22–24]. Аднаўленне і развіццё эканомікі рэспублікі праходзіла ў складанай аператыўнай абстаноўцы, якая характарызавалася высокім узроўнем крымінальнай злачыннасці. У першыя пасляваенныя гады назіраўся востры недахоп мясамалочных прадуктаў. У лістападзе 1946 г. ЦК КП(б) БССР, разгледзеўшы пытанне «Аб выкананні пастановы Савета Міністраў СССР і ЦК УКП(б) ад 27 чэрвеня 1946 г. «Аб мерах па забеспячэнню захаванасці хлеба, недапушчэнні яго разбазарвання, раскрадання псавання», запатрабаваў ад адміністрацыйных органаў рэзка ўзмацніць барацьбу з крадзяжамі збожжа [3, с. 21].

Органы міліцыі супрацьстаялі паралельна антысавецкім выступленням і змагаліся з арганізаванай злачыннасцю. Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад акупантаў злачынцы захоплівалі трафейную зброю і здзяйснялі цяжкія злачынствы. Вялікая роля ў барацьбе з крымінальнай злачыннасцю належала аддзелам крымінальнага вышуку. Асноўнай задачай апаратаў крымінальнага вышуку заставалася прадухіленне, раскрыццё злачынстваў і вышук злачынцаў [1, с. 121].

У маі 1946 г. ва ўпраўленнях унутраных спраў абласцей ствараліся мабільныя аператыўныя групы, якія складаліся з найбольш вопытных работнікаў. У іх абавязкі ўваходзіла атрыманне першага сігналу аб з'яўленні крымінальнай банды, неадкладна выязджаць на месцы здарэнняў і па гарачых слядах затрымліваць злачынцаў. У 1947 г. вырашылі прыцягваць супрацоўнікаў аддзелаў па барацьбе з бандытызмам да працы крымінальнага вышуку з мэтай узмацнення барацьбы са злачыннасцю. Меры гэтыя неўзабаве апраўдаліся на практыцы і прынеслі станоўчыя вынікі [1, с. 122].

З прычыны недахопу кадраў аператыўнымі работнікамі, акрамя вышуку, вяліся і следчыя дзеянні па крымінальных справах. Яшчэ да вайны СНК прыняў рашэнне, якое прадстаўляла права пракурорам даручаць міліцыі расследаванне любога злачынства. Міліцыя, не з’яўляючыся па законе органам папярэдняга следства, расследавала ў поўным аб'ёме крымінальныя справы ўсіх катэгорый. Толькі ў лютым 1948 г. у складзе ГУМ МУС СССР выдзелілі следчы аддзел. Такія ж аддзелы былі створаны і ў УМ МУС БССР і ў абласцях рэспублікі [1, с. 121].

МУС БССР ажыццяўляла мерапрыемствы, накіраваныя на ўзмацненне эфектыўнасці дзейнасці крымінальнага вышуку. З гэтай мэтай апараты вышуку папаўняліся падрыхтаванымі кадрамі, якія валодалі неабходным арсеналам аператыўна-вышуковай дзейнасці, методыкай фіксацыі доказаў, прыёмамі фізічнай барацьбы і ўменнем трапна страляць з баявой зброі [1, с. 122].



Эфектыўнай барацьбе са злачыннасцю садзейнічала ўкараненне навуковых дасягненняў экспертна-крыміналістычнай службы [1, с. 123].

У 1953 г. рэзка ўскладнілася крымінагенная абстаноўка. Узраслі крымінальны бандытызм, разбоі, махлярства, згвалтаванне, крадзяжы, а таксама п'янства і хуліганства. У асноўным гэта з'явілася следствам памылак пры правядзенні амністыі, абвешчанай Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 сакавіка 1953 г. У выніку ў ліпені 1953 г. быў ухвалены праект Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб непрымяненні амністыі да асоб, асуджаных за разбой, злодзеяў-рэцыдывістаў і злосных хуліганаў». Згодна з новым указам, калі былыя зняволеныя, вызваленыя па сакавіцкай амністыі, «працягвалі весці паразітычны лад жыцця і не займаліся грамадскай карыснай працай», іх зноў адпраўлялі ў месцы пазбаўлення волі [1, с. 125].

Не менш значнай праблемай для НКУС пасля вызвалення ўсходніх тэрыторый БССР была дзіцячая безнагляднасць і беспрытульнасць, якая ў 1942–1943 гг. была цалкам супастаўная з маштабамі гэтага бедства паслярэвалюцыйных гадоў, калі звыш 5,5 млн дзяцей страцілі сем'і. Вялізныя чалавечыя ахвяры і матэрыяльныя страты, масавае бежанства і акупацыя значнай часткі тэрыторыі СССР у першыя гады Вялікай Айчыннай вайны прывялі да імклівага росту дзіцячага сіроцтва, беспрытульнасці і безнагляднасці, а таксама спадарожнай ім злачыннасці [4, с. 1011–1017].

Сярод мер арганізацыйна-практычнага характару па барацьбе з дзіцячай безнагляднасцю і беспрытульнасцю, ажыццёўленых НКУС-МУС у пасляваенныя гады, істотную ролю адыграла прыцягненне да гэтага працэсу грамадскасці, у першую чаргу брыгад садзейнічання міліцыі (БСМ), члены якой актыўна ўдзельнічалі ў абходах і рэйдах на вуліцах, базарах, вакзалах і ў іншых грамадскіх месцах з мэтай канфіскацыі бяздомных дзяцей, працавалі ў дзіцячых пакоях міліцыі [5].

Важнае месца ў разгляданы перыяд займала папярэджанне і спыненне злачыннасці непаўналетніх участковымі ўпаўнаважанымі. У Інструкцыі ўчастковаму ўпаўнаважанаму міліцыі горада, уведзенай загадам МУС СССР ад 4 красавіка 1946 г. № 129, яго задачы ў барацьбе з дзіцячай безнагляднасцю, беспрытульнасцю і злачыннасцю складаліся ў прафілактыцы і спыненні дадзенай з'явы. У абавязкі ўчастковага ўпаўнаважанага міліцыі ўваходзілі выяўленне бацькоў, якія не ажыццяўляюць нагляд за дзецьмі, і папярэджанне іх пра адказнасць

за гэта; вывучэнне і ўлік месцаў магчымага з'яўлення і хованкі безнаглядных дзяцей; затрыманне і дастаўленне бацькам, у дзіцячыя пакоі або ў аддзяленні міліцыі безнаглядных дзяцей і непаўналетніх, якія парушаюць грамадскі парадак, займаюцца жабрацтвам, крадзяжом і іншымі злачынствамі. Участковы ўпаўнаважаны міліцыі абавязаны быў прыцягваць да сваёй працы членаў БСМ і іншых прадстаўнікоў грамадскасці. Дадзеная інструкцыя спрыяла прытоку грамадскасці на ліквідацыю безнагляднасці і беспрытульнасці дзяцей у другой палове 1940-х і пачатку 1950-х гг. [6].

Аддзел НКУС (з 1946 г. МУС) БССР па барацьбе з дзіцячай безнагляднасцю і беспрытульнасцю займаўся аналізам прычын дзіцячай безнагляднасці і беспрытульнасці, падчас якога высветлілася, што адсутнасць пазашкольнай работы з дзецьмі з'яўлялася адной з прычын дзіцячай безнагляднасці і беспрытульнасці. У 1950 г. у БССР было ўсяго сем абласных і шэсць раённых дамоў піянераў, шэсць станцый юных тэхнікаў, прычым усе яны знаходзіліся ў непрыстасаваных памяшканнях. Гэтага было недастаткова для задавальнення запытаў дзяцей. Неўладкаванасць у вольны ад вучобы час прыводзіла да таго, што яны былі прадастаўлены вуліцы, займаліся хуліганствам, парушалі правілы паводзін у грамадскіх месцах [7, с. 31].

Пасляваенны ўсплёск дзіцячай безнагляднасці і беспрытульнасці ў БССР, дзякуючы намаганням дзяржаўных органаў, і, у прыватнасці, органаў унутраных спраў рэспублікі, да канца 40-х гг. пайшоў на спад. Зменшылася колькасць беспрытульных і безнаглядных дзяцей і падлеткаў, затрыманых міліцыяй, былі зжытыя спараджаць безнагляднасць прычыны ваеннага ліхалецця. У асноўнай масе дзеці-сіроты былі ўладкаваныя ў дзіцячыя дамы, прыёмныя сем'і, на патранат і інш. [8, с. 58].

Такім чынам, у сакавіку 1946 г. Савет Народных Камісараў СССР быў ператвораны ў Савет Міністраў СССР, а народныя камісарыяты – у міністэрства. Аналагічны працэс адбыўся ва ўсіх саюзных рэспубліках. НКУС БССР быў перайменаваны ў Міністэрства ўнутраных спраў БССР. У першыя пасляваенныя гады і ў 1953 г., у перыяд правядзення амністыі, у рэспубліцы назіраўся рэзкі рост крымінальнай злачыннасці. Галоўная роля ў барацьбе з ёй належала ўпраўленням па барацьбе з бандытызмам, падраздзяленням крымінальнага вышуку і аддзелам БКСУ. Барацьбе са злачыннасцю садзейнічала ўкараненне навуковых дасягненняў экспертна-крыміналістычнай службы, што рэалізоўвалася праз дзейнасць навукова-тэхнічных аддзелаў органаў міліцыі.

У 1940-х – пачатку 1950-х гг. НКУС-МУС БССР была праведзена вялікая праца па стварэнні арганізацыйнай структуры, прызначанай для барацьбы з дзіцячай безнагляднасцю і беспрытульнасцю. Створаная сістэма органаў і мер дала магчымасць у адносна кароткія тэрміны ліквідаваць гэту з'яву ў масавых маштабах.



## Спіс выкарыстаных крыніц

1. История органов внутренних дел Беларуси : курс лекций / А.Ф. Вишневский [и др.] ; под ред. А.Ф. Вишневского ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь». – Минск : Акад. МВД, 2010. – 218 с.

2. Волженков, В.В. Становление и развитие органов внутренних дел Республики Беларусь : лекции / В.В. Волженков. – М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образование «Могилев. Ин-т М-ва внутр. дел Респ. Беларусь».

3. Лапанович, С.Ф. История создания и деятельности службы по борьбе с экономическими преступлениями (ОБХСС-БЭП) Беларуси : лекция / С.Ф. Лапанович. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2010. – 39 с.

4. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – М., 1953.

5. Архив МВД Республики Беларусь. – Ф. 50. Оп. 2. Д. 25. Л. 170.

6. Архив МВД Республики Беларусь. – Ф. 51. Оп. 3. Д. 6. Л. 97–98.

7. Данилов, В.А. Причины детской безнадзорности и беспризорности в Беларуси в начале 50-х гг. XX в. / 95 лет милиции Беларуси : материалы респ. науч.-практ. конф. (Минск, 1 марта 2012 г.) / М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь». – Минск : Акад. МВД, 2012. – 139 с.

8. Данилов, В.А. Организационные основы борьбы НКВД-МВД Беларуси с детской безнадзорностью и беспризорностью во время Великой Отечественной войны и в первые послевоенные годы (1944–1947 гг.) / В.А. Данилов // Милиции Беларуси 90 лет: история и современность : материалы науч.-практ. конф. (Минск, 27 февр. 2007 г.) / редкол.: К.И. Барвинок (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2007. – С. 54–58.

УДК 342.9

***Д.С. Барсук***, курсант факультета милиции

Научный руководитель – кандидат юридических наук,
доцент *О.В. Гиммельрейх*

## ИНСТИТУТ МЕДИАИЗМЕРЕНИЙ КАК КОМПОНЕНТ СИСТЕМЫ ИНФОРМАЦИОННОЙ БЕЗОПАСНОСТИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ И РАЗНОВИДНОСТЬ УПРАВЛЕНЧЕСКОГО МОНИТОРИНГА

Глобальное возрастание роли информации в системе общественных отношений, открытость информационного пространства и повышение уровня информатизации населения обусловливают новые меры